ЗГОДА

ІНФАРМАЦЫЙНА-АНАЛІТЫЧНЫ ШТОТЫДНЁВІК
http://www.zgoda-weekly.org
№ 2 (277) 17 — 24 студзеня 2003 г.

СОЮЗ НЕРУШИМЫЙ

РОССИЯ ФИКС

АЛЕКСЕЙ МАКОВЕЦ

Белорусская озабоченность отношениями с Россией приобрела статус *idee fixe* — навязчивой идеи национального масштаба. Особенно российский синдром обостряется накануне встреч Владимира Путина и Александра Лукашенко.



НАШ ВЕРНИСАЖ. «Это только газеты наш союз не любят», художник АЛЕКСАНДР СДВИЖКОВ-ТЕРНЕР

БЛИЖАЙШЕЕ ЗАРУБЕЖЬЕ

Теснота российско-белорусских сношений стала общим идеологическим местом, где антипрезидентская оппозиция сходится с пропрезидентскими пропагандистами. Тому есть веские основания: энергетически-сырьевая зависимость, пресловутые хозяйственные связи советского образца, российская товарная экспансия после 1998 года.

Так объективно сложилось, что экономически мы вышли из одной почившей в бозе соцсистемы. Экономика – главный аргумент в объяснении, почему Россия нам – наиближайшее из зарубежий.

Бабки у метро в розницу приторговывают американским «бондом» российского производства, с российской же акцизной маркой. Остановились российские ГАЗ и ВАЗ – борисовские заводы агрегатов и «Автогидроусилитель» тоже отправили сотрудников в отпуска.

А на горизонте все так же маячит призрак единой российско-белорусской валюты, которой несомненно должен стать *RUR*, а не *BYR*.

Есть и информационный повод. То есть информационное пространство Беларуси утонуло в российском вещании. Что не российское – то русскоязычное. Что не русскоязычное – то еле смотрят.

Последний хит сезона – пресс-релиз БНФ. Сам Винцук Вечерка, председатель партии БНФ, наирусофобнейшей из оппозиционных, выступил против ограничения российского вещания на Беларусь. Лидер БНФ узрел в закрытии эфира русскоязычных радиостанций «Маяк», «Голос России» и «Юность» ограничение свободы белорусов в доступе к информации. Недобрым словом в пресс-релизе помянули и сокращение телевещания НТВ, «Культуры», ОРТ, РТР.

«Голос России» нам теперь вместо «Голоса Америки». Вот партийный руководитель Вечерка и попрекнул белорусские власти стремлением к тотальному контролю над информационным пространством. Но тут же оговорился. Де, после невесть когда грядущего ухода Александра Лукашенко, мы столкнемся с украинской проблемой. Как то: доминирование российских масс-медиа в нашем информационном пространстве. Словно ныне такой проблемы нет.

Какая бы ни была российская метрополия, а именно эти самые имперские СМИ обеспечивают белорусским гражданам свободу информации. Хотя за казенное белорусскоязычие придется заплатить информационным голодом.

Вообще же в белорусских отношениях к России проявляются любопытные тенденции. Пропрезидентский официоз, прежде разрабатывавший жилу русско-белорусской любви, после путинских-газпромоских демаршей давит на суверенитет. Притом что как сидели мы на российской нефтегазовой игле, так и сидим. БНФ же, напротив, дошел до признания – не так вредна Россия, как ее малюют государственные СМИ.

Идеологические установки слегка поменялись. Но базовая посылка остается прежней. Слишком многое во внутренних белорусских делах зависит от России.

НАВЯЗЧИВАЯ БЕЛОРУССКАЯ ИДЕЯ

За время интеграционных кампаний российско-белорусские отношения превратились в особую, самодостаточную тему. В идею фикс. От нее танцуют и оппозиционеры, и власть предержащая, и добрая доля населения. Русские и прочие россияне все еще нам слишком не чужие, чтобы воспринимать их как иностранцев. А Россия – все еще не заграница.

В первой половине 90-х лидеры постсоветских республик приходили к власти на сепаратизме. В Беларуси – на обещаниях восстановить хозяйственные связи. Белорусский вариант сепаратизма был слишком завязан на отрицании российского засилья. Для полноценного сепаратизма нам не хватило самодостаточности, сознания собственной самоценности. Русификация-советизация как источник белорусских бед не давала ответа, чем же мы, белорусы, такие уникальные, такие ценные сами по себе. Независимо от того, есть Россия или нет.

Да, Российская империя захватила белорусские территории, но когда они уже входили в состав Речи Посполитой. Ее первый раздел состоялся в 1772 году, а старобелорусский язык утратил статус официального языка Великого княжества Литовского еще в 1696, после решения Генеральной Конфедерации в Варшаве. Но что-то не заметно сильных антипольских настроений.

Игрушечная государственность белорусов в СССР, миф о Великой отечественной, советская политика русификации – все это серьезные доводы в пользу навязчивой идеи о российской роли в белорусской судьбе.

Уже десять суверенных лет прошло, а национальное самосознание и ныне там же, где экономика и внешняя политика. Беларусь, что оппозиционная, что пропрезиденсткая, глядит на Россию. То со страхом, то с надеждами.

Социологические изыскания белорусского НИСЭПИ под руководством Олега Манаева и американского института Гэллапа выявляют тот еще комплекс национальной неполноценности.

В октябре-ноябре прошлого года институт Гэллапа по заказу Международного республиканского института опросил 2886 белорусов. Выяснилось, что, согласно американским исследованиям, в белорусских головах царит полная неразбериха.

Две трети респондентов Гэллапа за еще более тесные сношения с Россией, хотя теснее можно только в составе РСФСР. Еще почти треть – за те же белорусско-российские связи, что теперь. И в то же время за отношения по модели Евросоюза выступает половина от общего числа гэллаповских респондентов, а в Россию хочет процент, едва превышающий статистическую погрешность. То есть половина сразу хочет и в Евросоюз, и в РСФСР вместе. А одна пятая еще и желает вернуться в СССР.

А вот данные опроса НИСЭПИ за декабрь 2002 года (метод *face to face*, опрошено 1478 респондентов, ошибка репрезентативности не выше 0.03). Манаевские опросы отмечают ту же устойчивую тенденцию. Российско-белорусские отношения по своей насущности – на почетном втором месте после состояния экономики. Напрашивается подозрение, что эти две больные темы как-то взаимосвязаны.

Окончание на стр. 3 ➲

ВГЛЯДИСЬ В РОССИЮ

Зачем русским нужны братки-белорусы?

ВИКТОР ГУСЕВ, Ульяновск

Почему российская провинция выступает за союз с лукашенковской Беларусью, лучше всего понимают сами дорогие россияне.

О чем болит душа у простого россиянина в глубинке? Как ни странно прозвучит, помимо повседневных головных болей на тему маленькой зарплаты, отсутствия отопления, горячей воды и электричества, умы рабочих и колхозников сильно заняты внешней политикой. И факт этот подтвержден серьезными социологическими исследованиями. В самых что ни на есть глухих деревнях Черноземья, Поволжья, Урала и других регионов подключают к онемевшему телевизору последний аккумулятор, чтобы услышать новые откровения Путина или увидеть полчища американских агрессоров, что скапливаются на границах Ирака.

От таких и подобных этому кадров даже в самых аполитичных россиянах *«ярость благородная вскипает, как волна»*. Хотя всякий бесшабашный патриот в антиамериканском запале понимает: как бы ни хотелось здесь и сейчас укротить вконец распоясавшегося Буша, возможности современной России даже не позволяют как следует помечтать о том. Остается успокаивать больное самолюбие думой о грядущем неизбежном возрождении былой мощи сверхдержавы, которое опять же может произойти только через воссоединение братских народов, расколотых предателями в белорусском Беловежье.

По сей день именно лукашенковская Беларусь, точнее, бесчисленное количество раз пропиаренный российскими СМИ *«процесс создания Союзного* (обязательно с большой буквы «С»!) *государства»* дает геополитически озабоченным шоферам, дояркам и дворникам весьма осязаемую надежду на восстание из пепла демократического развализма великого и могучего СССР.

Иначе кровожадные Штаты (или НАТО, кому что больше нравится), поразмявшись в Югославии и Афганистане и вдоволь напившись иракской нефти, обязательно двинут свои армады за якутскими алмазами и ямальским газом с баз на территории свежеприсоединенных поляков и прибалтов. А так поставит Россия, объединившись со славянской сестрой, где-нибудь под Брестом оставшиеся от эпохи гонки вооружений крылатые ракеты. Тогда поостынут головы брюссельских ястребов, и перестанут они беспардонничать на переговорах, тыча нас носом в безразмерные горбачевско-ельцинские долги.

Тогда можно будет немного передохнуть и заняться внутренним переустройством, опять же взяв за образец методику Лукашенко. О ней политик с деревенской завалинки судит по сообщениям московских СМИ да по рассказам шоферов-дальнобойщиков. То, что видит и слышит измученный развалом завода-колхоза и коллапсом социально-коммунальной инфраструктуры российский провинциал о белорусском настоящем, представляется ему манной небесной.

Потому что в белорусских домах есть свет, газ и тепло, нет безработицы и криминального беспредела на улицах. И самое главное – минский чиновник не властвует безраздельно в своем уделе, а, как при коммунистах, дрожит перед батькой. И простой человек всегда может упасть батьке в ноги, и полетят головы кровопийцев-бюрократов без суда и следствия.

А что всякие там купленные тем же НАТО журналисты про ущемление свободы слова и пропажу оппозиционеров голосят, только лишний раз подтверждает, как прав Александр Григорьевич. Ведь если и есть в Беларуси проблемы, то только из-за происков Америки, которая хочет задушить последний островок социализма, насобирав диссидентских жалоб на гуманитарную интервенцию (далее следует вышеупомянутый сценарий про натовские контингенты у российских нефтяных вышек и газовых труб.

Конечно, нефть и газ по льготным ценам несколько омрачают радужные картины славянского единства. Даже славянофилы и поклонники Лукашенко у остывших батарей в поисках виноватого иногда вспоминают про Минск и даже высказывают такую крамолу, что белорусский энергокоммунальный рай зиждется на дармовых российских мазуте, угле и газе.

Окончание на стр. 4 ➲

АНЕКДОТ-С

Лукашенко – Путину:

– В этом году мы хотим, чтобы вы увеличили поставки газа.

– Пожалуйста!

– Мы также хотим увеличения поставок нефти.

– Нет проблем.

– Мы настаиваем, чтобы белорусским товарам был открыт свободный доступ на российский рынок!

– Почему бы и нет!

– Хорошо бы нам все это увязать в новом союзном договоре.

– Прекрасно, давайте заключим договор, по которому Россия обязуется построить в Беларуси рыночный социализм.

* * *

– Что в российско-белорусском союзе крепче всего и самое постоянное?

– Временные трудности на пути объединения в одно государство.

ХИТ-ПАРАД ГЛУПОСТИ

«Такой красивой и одиозной игры уже не видел давно»

(В. Мюлющенко, «Компьютерная газета», 8.01.03)

«Селедка и карп в сетях госпрограммы»

(А. Потребин, «Республика», 15.01.03)

«Водитель – самый опасный узел автомобиля»

(Е. Денисенко, «Советская Белоруссия», 15.01.03)

НАВІНЫ

Цукеркі. Буйны беларускі вытворца цукерак фабрыка «Камунарка» скарачае асартымент сваёй прадукцыі. «Камунарка» вырашыла перайсці на выпуск толькі вядомых марак цукерак і працаваць на прасоўванне ўласных брэндаў. Сёння фабрыка прапануе звыш 200 найменняў прадукцыі. Але такая разнастайнасць не ўратоўвае ад канкурэнтаў з Расіі і Украіны. Пасля атрымання міжнароднага сертыфіката стандарту якасці *ICO* 9001 прадпрыемства павялічыць пастаўкі на экспарт. Пакуль жа за мяжу ідзе пераважна карамель, а «Сталічныя», «Грыльяж», «Труфелі» разыходзяцца на ўнутраным рынку. Аднак менавіта на гэтых салодкіх брэндах будзе будавацца далейшая стратэгія прадпрыемства: скарачэнне асартыменту і павышэнне ўвагі да элітных марак.

Аўто. Падпісана пагадненне аб адкрыцці ў Стаўрапалі вытворчасці па зборцы аўтобусаў Мінскага аўтамабільнага завода. Трохбаковае пагадненне аб зборцы аўтобусаў маркі «МАЗ» у сталіцы Стаўрапольля падпісалі першы намеснік генеральнага дырэктара МАЗа А. Турбалін, першы намеснік ФГУП «Дзяржаўная інвестыцыйная карпарацыя» У. Кажамякін і галава адміністрацыі Стаўрапалю Д. Кузьмін. Зборка будзе ажыццяўляцца з машынакамплектаў, пастаўленых з Мінску. Тым часам Міністэрства эканомікі праверыць працу Мінскага трактарнага завода і эфектыўнасць рэалізацыі яго прадукцыі ў Расійскую Федэрацыю. Такое даручэнне даў прэм'ер-міністр Беларусі Генадзь Навіцкі пад час нарады першаму намесніку міністра эканомікі Мікалаю Зайчанку.

Лукамол. Аляксандр Лукашэнка 13 студзеня 2003 года выдаў указ №16 «Аб дзяржаўнай падтрымцы грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Дакумент прадугледжвае аказанне фінансавай дапамогі БРСМ на перыяд ягонага станаўлення (да 2006 года), а таксама ўтрымлівае неабходныя прававыя і іншыя захады для *«стварэння магутнай моладзевай арганізацыі ў краіне, павышэння яе ролі ў вырашэнні задачаў дзяржаўнай моладзевай палітыкі»*, – паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Бандажэўскі. Былы рэктар Гомельскага медычнага інстытута, прафесар Юрый Бандажэўскі, якога асудзіў беларускі суд да васьмі год пазбаўлення волі, атрымаў званне ганаровага грамадзяніна французскага горада Клярмонт-Феран (горада-пабраціма Гомеля) за працу па вывучэнню наступстваў Чарнобыльскай катастрофы. Пра гэта паведамляецца ў лісце, дасланым сям'і вядомага навукоўца мэрам горада Клярмонт-Феран Сержам Гадардам. Спадар Гадард таксама запрасіў жонку і дачку Юрыя Бандажэўскага ў Клярмонт-Феран, дзе ім уручаць узнагароду для прафесара. Арганізацыяй візіту будзе займацца амбасада Францыі ў Беларусі.

Пакаранне. Мінскі гарадскі суд пакараў міліцыянтаў Аляксандра Белага і Максіма Астраўлянчыка пазбаўленнем волі на 15 гадоў. Гэтыя былыя супрацоўнікі ізалятара часовага ўтрымання збілі затрыманага Мікалая Нагорнага. Суд высветліў, што Аляксандар Белы і Максім Астраўлянчык збівалі яго напрацягу шасці гадзінаў, пакуль не забілі. Судмедэксперты зафіксавалі мноства пераломаў і кровазліццяў.

Кнігі. Мінскі офіс Беларускай асацыяцыі журналістаў працягвае акцыю збору кніг для бібліятэк папраўчых установ адкрытага тыпу ў Жлобіне і Асіповічах. Пасля публікацыі ў газеце «Народная воля» рэпартажа Уладзміра Дзюбы пра сустрэчу дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў з Міколам Маркевічам і Паўлам Мажэйкам чытачы «НВ» ужо сабралі для гэтых установ 88 кніг. БАЖ запрашае сяброў і прыхільнікаў арганізацыі далучацца да акцыі. Кнігі прымаюцца з 10.00 да 18.00 у працоўныя дні ў офісе БАЖ па адрасе: пл. Свабоды, 17, оф. 304.

Ліст. Аддзяленне арганізацыі *Amnesty International* у Нямеччыне накіравала генеральнаму пракурору Беларусі Віктару Шэйману ліст з заклікам *«неадкладнага вызвалення журналістаў»*, асуджаных за публікацыю крытычных матэрыялаў аб Аляксандры Лукашэнку. Прадстаўнік нямецкага аддзялення арганізацыі Рыта Вінанд адзначыла ў лісце, што асуджэнне ў 2002 годзе журналістаў з Горадні Мікалая Маркевіча і Паўла Мажэйкі, а таксама галоўнага рэдактара газеты «Рабочы» з Мінску Віктара Івашкевіча *«выклікала пратэст ва ўсім свеце»*. Суды над імі, на думку нямецкіх праваабаронцаў, былі яскравым прыкладам *«парушэння правоў чалавека ў Беларусі»*. *«Гэтыя журналісты з'яўляюцца вязнямі сумлення і былі асуджаны выключна за іх погляды»*, – падкрэсліла Рыта Вінанд.

Памяць. Рада Беларускага ПЭН-цэнтру звярнулася ў Сусветны ПЭН-клуб з прапановаю абвесціць 29 кастрычніка Сусветным днём памяці рэпрэсаваных пісьменнікаў. Ноч з 29 на 30 кастрычніка 1937 года сталася *«чорным днём календара»* для нашай літаратуры. За адну ноч у Курапатах НКУС расстраляла 22 літаратара. Усяго ж, паводле падлікаў даследчыка Леаніда Маракова, за сталінскім часам рэпрэсавалі 440 беларускіх пісьменнікаў з 550-ці, якія на той час займаліся творчасцю. Абвесціць гэты кастрычніцкі дзень Днём памяці прапанаваў гісторык Анатоль Сідарэвіч.

Акцыя. 20 студзеня спаўняецца год, як у Віцебску знік адзін з мясцовых лідэраў БНФ Юрась Корбан. Адразу пасля знікнення ён некалькі разоў тэлефанаваў маці, а праз нейкі час папрасіў прыехаць на сустрэчу з невядомымі людзьмі ў Мінск. Гэта быў апошні званок. Ён, як паведамілі ў Маладым фронце, быў са скрыжавання праспекта Скарыны і бульвара Талбухіна. У гэтым месцы, па пэўных звестках, знаходзіцца адна з сакрэтных спецслужбаў. На сувязь са сваякамі хлопца так ніхто і не выйшаў. Прайшоў год, але пра лёс 24-гадовага Юрася Корбана нічога невядома. Зварот у праваахоўныя органы таксама не прынёс плёну. З нагоды гадавіны знікнення юнака родныя Юрася Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага і Зміцера Завадскага звярнуліся да грамадскасці падтрымаць блізкіх Юрася Корбана. 20 студзеня ў Мінску ладзіцца «жывы ланцуг», каб нагадаць аб гэтым трагічным здарэнні. Акцыя пачнецца на Кастрычніцкай плошчы а 12-й гадзіне.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

БНФ ламае стэрэатып

АЛЕСЯ ГОРДЗІНА

Каля паловы кандыдатаў БНФ на мясцовыя выбары сабралі неабходную колькасць галасоў для рэгістрацыі. Такія дадзеныя агучаны на сойме, што адбыўся 11 студзеня.

Сябры БНФ абмеркавалі падрыхтоўку да мясцовых выбараў. *«Тыя франтаўцы, што выставіліся кандыдатамі, і тыя, што ўвайшлі ў ініцыятыўныя групы, сустракаюць пераважна прыхільнае стаўленне людзей, якія згадаліся на жывыя кантакты, на жывыя надзённыя палітычныя размовы,* – паведаміў старшыня БНФ Вінцук Вячорка. – *Значыць, грамадства аджыло. Ужо толькі дзеля гэтага варта было ўваходзіць у кампанію мясцовых выбараў».*

Паводле словаў лідэра БНФ, сустракаючыся з выбаршчыкамі пад час збору подпісаў, франтаўцы ламаюць стэрэатып пра сябе, створаны афіцыйнай прапагандай. *«Прыходзіць разумны, інтэлігентны, з веданнем мясцовых праблемаў чалавек,* – адзначыў Вінцук Вячорка. – *Па ім і мяркуюць пра фронт, што БНФ – гэта, аказваецца, разумныя мужчыны і жанчыны, хлопцы і дзяўчаты».*

Разам з тым, франтаўцы не маюць ілюзіяў наконт сумленнасці выбараў. Пра гэта яскрава сведчаць адмовы сябрам БНФ уключыць іх ў выбарчыя камісіі. Таму, як было адзначана на сойме, *«аб'ём і нахабства фальсіфікацыяў будуць як заўсёды»*. Але досвед гэтай кампаніі будзе выкарыстаны *«на наступным этапе палітычнай барацьбы»* пад час будучых парламенцкіх выбараў. *«Нам трэба ставіць задачу, каб у выніку гэтай палітычнай кампаніі рэйтынг партыі БНФ, а значыць, веданне людзей пра нашыя ідэалы і каштоўнасці, узрос, прынамсі, у паўтара, а лепш у два разы,* – зазначыў Вінцук Вячорка. – *Стратэгічная мэта – выйсці з кампаніі мясцовых выбараў памацнелай, структураванай, сучаснай палітычнай партыяй, якая адзіная ў гэтай краіне праклямуе як сваю галоўную мэту незалежнасць Беларусі».*

На сойме было прынятае рашэнне аб выключэнні з партыі яе сябра Вячаслава Сіўчыка з фармулёўкай *«за дэструктыўную антыпартыйную дзейнасць»*. Сам спадар Сіўчык паседжанне кіруючага органа партыі праігнараваў, хаця быў запрошаны не толькі вусна, але нават у пісьмовай форме.

Прыезд Пуціна ў Мінск, што мае адбыцца 19–20 студзеня, у БНФ расцэньваюць як працягванне эканамічнага ціску на Беларусь. Расійскія візіцёры, на думку франтаўцаў, будуць дамагацца канкрэтных эканамічных саступак, у тым ліку здачы беларускіх прадпрыемстваў. Рэакцыя на гэты прыезд, паведамілі на сойме, будзе абавязковай. *«Але аднымі пікетамі тут не абысціся,* – заявіў Вінцук Вячорка. – *Неабходна думаць пра спосабы эканамічнага самавыратавання Беларусі. Фронту трэба тэрмінова распачаць пабудову, сама меней, трох мазгавых цэнтраў, якія засведчаць, што ў фронце ёсць належны мэнэджэрскі і навуковы патэнцыял, якія пакажуць цяперашнім так званым элітам, у тым ліку і бізнесовым, што з фронтам можна мець справу».*

Сойм прыняў таксама заяву аб удзеле партыі ў святкаванні 85-х угодак утварэння Беларускай народнай рэспублікі (БНР). Фронт заклікаў астатнія партыі, а таксама грамадскасць далучыцца да працы Нацыянальнага аргкамітэта, які ўзначаліў прафесар Анатоль Грыцкевіч, па святкаванні гэтай даты.

■

Эсдэкі аб'ядноўваюцца

АЛЕСЯ ГОРДЗІНА

Паміж прадстаўнікамі Беларускай сацыял-дэмакратычнай грамады і Аб'яднанай сацыял-дэмакратычнай партыі дасягнута дамоўленасць аб аб'яднанні.

Як вядома, улады адмовілі ў рэгістрацыі АСДП па палітычных матывах. Але зрабілі гэтым толькі горш сабе. Бо непрызнаныя эсдэкі задзейнічалі запасны варыянт легалізацыі партыі, які цяпер стаў асноўным – інтэграцыя з сацыял-дэмакратамі Станіслава Шушкевіча. Гэты працэс толькі паспрыяе ўзмацненню сацыял-дэмакратычных сілаў, апазіцыйных сённяшняму рэжыму.

На пашыраным паседжанні выканкама АСДП, што адбылося 11 студзеня з удзелам усіх кіраўнікоў абласных арганізацыяў, быў абмеркаваны працэс аб'яднання. Рашэнне аб злучэнні прыняла і цэнтральная рада БСДГ. *«Пераадоленыя ўсе амбіцыі, дасягнутая выразная яснасць па гэтым пытанні»,* – адзначыў намеснік старшыні АСДП Аляксей Кароль.

Ужо створаныя аб'яднаныя арганізацыі АСДП і БСДГ у Гомелі і Брэсце. Злучэнне дзвюх партыяў адбудзецца на з'ездзе БСДГ, які будзе насіць фармат аб'яднаўчага. Да той пары АСДП збіраецца правесці свой з'езд, каб, паводле словаў Аляксея Караля, партыйцы *«свядома прынялі рашэнне аб аб'яднанні».*

«Гэта наш адэкватны адказ на палітычнае рашэнне ўладаў аб нерэгістрацыі, – зазначыў Аляксей Кароль. – *Для нас галоўная задача – стварыць у Беларусі адну моцную сацыял-дэмакратычную партыю. І мы заклікаем да гэтага працэсу ўсіх – і Партыю працы Аляксандра Бухвостава, і Народную грамаду Мікалая Статкевіча».*

Аб'яднаўчы з'езд абярэ кіраўніцтва партыі. Але ўжо зараз можна меркаваць, што ўзначаліць аб'яднаных сацыял-дэмакратаў лідэр БСДГ Станіслаў Шушкевіч.

■

СКАНДАЛ

Фашызм не пройдзе!

АЛЕСЯ ГОРДЗІНА

Дэмакратычная грамадскасць Оршы прыняла зварот да гарадскіх уладаў, а таксама накіравала скаргу ў пракуратуру з нагоды выступлення рускай фашыстоўскай групы «*Коловрат*».

Канцэрт адбыўся ў снежні. *«У той дзень жыхары нашага горада маглі назіраць карціну, як брытагаловыя малойчыкі РНЕ (Русского национального единства) са сцягамі, са свастыкай шпацыравалі па вуліцах, крычалі «Хайль Гітлер!» і агучвалі пагрозы ў бок прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцяў,* – распавёў старшыня гарадской аршанскай арганізацыі партыі БНФ Алесь Шутаў. – *Нават адна з такіх групаў збіла актывістку «Зубра» ў электрычцы. Упершыню пасля 1944 года фашысты свабодна адчувалі сябе ў нашым горадзе».*

Перад канцэртам фанаты групы ўчынілі бойкі. Паводле словаў сведкаў, прысутнічалі даволі значныя сілы міліцыі, і РНЕшнікаў здымалі на відэакамеру супрацоўнікі КДБ. Аднак малойчыкам усё сышло з рук.

Цікава адзначыць, што арганізатарам скандальнага шоу выступіў Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі (БРСМ). Як вядома, гэта арганізацыя з'явілася на свет у мінулым годзе шляхам зліцця Беларускага патрыятычнага саюза моладзі (заўзятараў Лукашэнкі) і Беларускага саюза моладзі (былых камсамольцаў). Перад канцэртам з вітальнай прамовай выступіў другі сакратар аршанскага гаркама БРСМ Дзмітры Бухавец. Выступы гурта чаргаваліся з поклічамі міжнацыянальнай і міжрасавай варожасці.

Прадстаўнікі партый БНФ, АГП, БСДП, Таварыства беларускай мовы і Беларускага хельсінкскага камітэта, што падалі скаргу, атрымалі адказ, што яе перанакіравалі ў гарадскі аддзел унутраных справаў. Дэмакратычныя арганізацыі маюць намер вымусіць праваахоўныя органы і ўлады адрэагаваць на фашыстоўскі шабаш. *«Такі абуральны факт не павінен застацца без увагі,* – зазначыў Алесь Шутаў. – *Любыя праявы фашызму на Беларусі, якая пацярпела ад гэтай навалы больш за іншыя краіны, павінны адназначна і катэгарычна быць асуджаныя. А тыя асобы, што прымалі ўдзел у арганізацыі фашыстоўскага зборышча, павінны быць прыцягнуты да адказнасці – як прававой, так і маральнай».*

■

ПРЭС-ХАТА

З журналістамі расправіліся

АЛЕСЯ ГОРДЗІНА

Адбылася чарговая расправа з незалежнымі беларускімі журналістамі. Супрацоўнікі прафсаюзнай газеты «Беларускі час» звольнены з працы ў поўным складзе.

Дамоклаў меч над «Беларускім часам» завіс яшчэ ўлетку. Пасля змены кіраўніцтва ў Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, якую ўзначаліў стаўленік Лукашэнкі Леанід Козік, новы старшыня звольніў тагачаснага рэдактара Аляксандра Старыкевіча. Спадзяванні былі на тое, што астатнія супрацоўнікі рэдакцыі правільна зразумеюць намёк. Але ўхваленняў на свой адрас і вышэйшага кіраўніцтва дзяржавы Леанід Козік так і не дачакаўся. Тады ў дачыненні да журналістаў была пушчана ў ход тактыка выжывання. У прамым сэнсе гэтага слова.

Выканаўца абавязкаў рэдактара Ірына Германовіч была звольненая, а для астатніх устаноўлены няпоўны рабочы дзень – 2 гадзіны з акладам 0,25 стаўкі. Супрацоўнікам выплочвалі мізэрныя заробкі, дый тое з вялікімі затрымкамі. Калі ж пабачылі, што журналісты і пасля гэтага «яшчэ жывуць», акурат перад Калядамі ім паднеслі сюрпрыз – усіх звольнілі па скарачэнні штату *«у сувязі з цяжкім фінансавым становішчам».*

Газета не спыніла свой выхад. Яе робяць зараз на чале з новым прызначаным рэдактарам Святланай Балашовай тэхнічны персанал. Можна не сумнявацца, што выпраўленне фінансавага становішча не прымусіць сябе доўга чакаць, і рэдакцыя абзавядзецца *«чэснымі»* журналістамі.

■

БЕЛАРУСЬ В ЕВРОПУ

Миссия выполнима, но попозже



СЕРГЕЙ ПУЛЬША

Технический персонал минского офиса ОБСЕ приступил к работе 13 января. Иностранные сотрудники новой миссии Организации по безопасности и сотрудничеству в Европе должны приступить к работе 3 февраля. Об этом БелаПАН сообщил помощник по вопросам программ белорусского бюро ОБСЕ Дмитрий Алешкевич.

По словам Дмитрия Алешкевича, 8 января на официальном сайте управления по вопросам трудоустройства ОБСЕ объявлен конкурс на замещение вакансий в офисе ОБСЕ в Беларуси. Последний срок подачи заявок — 21 января, затем состоится собеседование с кандидатами и 3 февраля иностранные сотрудники миссии должны приступить к работе в минском офисе ОБСЕ. Это касается всех сотрудников офиса кроме его руководителя, которого, в соответствии с новым мандатом, должен назначить действующий председатель — министр иностранных дел Нидерландов Йаап де Хооп Шеффер. Кандидатура руководителя должна быть одобрена белорусскими властями.

Поэтому полномочия миссии ОБСЕ в Беларуси продолжают оставаться неизвестными. Европа по-прежнему с недоверием относится к официальному Минску. Такого же мнения придерживается и спецдокладчик ПАСЕ по Беларуси Вольфганг Берендт.

«По предварительной информации, достигнуты не такие уж серьезные договоренности. За рамками соглашения осталось наблюдение за соблюдением прав человека, свободы СМИ. Очень важным показателем будет проведение выборов в местные советы, насколько свободно и прозрачно будет организована избирательная кампания», — сказал он.

В отношениях Беларуси с Советом Европы, по мнению Берендта, также *«мало позитивного»*. Среди положительных факторов он назвал появление в белорусском парламенте небольшой группы депутатов, которые придерживаются *«европейского пути»* развития страны. *«Заслуживает внимания инициатива генерала Валерия Фролова относительно расследования дел о пропавших политиках. Однако то, что касается свободы СМИ, прав оппозиции... здесь одни негативные симптомы»*, — подчеркнул Берендт.

Так что нового офиса ОБСЕ в Минске вызывает, скорее, больше вопросов, чем ответов. Португалия красиво закончила свой срок на посту председателя ОБСЕ, а Нидерландам спешить некуда. ■

...АЦЫЯЛІЗМУ

Паказалі сябе рынкавымі патрыётамі нават буйнейшыя на Міншчыне незалежныя тыднёвікі «Барысаўскія навіны» і «*Курьер из Борисова*», якія афішавалі ўзгаданую рынкавую акцыю. Стартавыя кошты чатырох зямельных участкаў складалі ў сярэднім па 1 400 000 рублёў за кожны.

Нягледзячы на актыўную папярэднюю рэкламу, заява на ўдзел у аукцыёне прыйшла ўсяго ад аднаго пакупніка. Не вытрымлівалася галоўная ўмова правядзення падобных гандлёвых мерапрыемстваў — наяўнасць канкурэнтнага асяроддзя пакупнікоў. Таму адмысловая камісія 8 студзеня афіцыйна прызнала: аукцыён не адбыўся. Адзінаму магчымаму ўдзельніку былі вернутыя сумы спецзбору і залогу.

жыхароў не любіць цэнтр, ягоны шум і тлум. На такіх вось людзей, дарэчы, і разлічвалі арганізатары аўкцыёну.

Прычынай зрыву аукцыёну Уладзімір Вабішчэвіч лічыць беднасць барысаўцаў у асноўнай сваёй масе. Для іх набыць зямельны ўчастак за суму, роўную па курсу сямістам даларам ЗША — непасільная праблема. А тут яшчэ гэткая сума — усяго толькі стартавая.

На вялікі жаль, у Барысаве, дзе сярэдні заробак у эквіваленце троху больш чым сто далараў за месяц, няма дзе зарабіць столькі грошай, каб іх хапіла на аплату камунальных паслугаў, на харчаванне, на вопратку-абутак, ды яшчэ крыху адкласці на гэтак званы чорны дзень.

Некалі, кажуць тубыльцы, [illegible] і не выпускалі з канца снежня да канца першай дэкады студзеня камплектныя дэталі і «БАТЭ» з «Аўтагідраўзмацняльнікам». Людзі былі адпраўленыя ў адпачынак з выплатай ім 75 адсоткаў сярэдняга заробку. Дзе ўжо тут заробіш? Застацца б жывому.

Фактычна амаль паўгады фактычна не працуе Барысаўскае прадпрыемства музычных інструментаў, якое выпускае ад савецкіх часоў знакамітыя піяніна маркі «Беларусь». Але тады гэта фабрыка квітнела і выбрабляла за год 22 тысячы інструментаў, а цяпер, як мне распавёў намеснік дырэктара спадар Сакалоўскі, крыху больш сотні штук.

Знік вялікі эсэсэсэраўскі попыт. Пачалі жыць і працаваць на зака... ства з адной амерыканскай фірмай музычных інструментаў. Зараз мы вядзем з нашымі заакіянскімі партнёрамі перамовы. Мы ім прадстаўляем вольныя вытворчыя плошчы, а яны ўкладваюць у вытворчасць грошы, адчыняюць дзверы на свае рынкі збыту. Свой пакет прапаноў на гэты конт мы даслалі ў ЗША. Цяпер чакаем іхняга пакету, — паведаміў адміністратар фабрікі.

Магчыма, землякам і пашанцуе, магчыма, дзелавы і добры заакіянскі дзядзька дапаможа майстрам піяніна маркі «Беларусь», якія сёння, жывучы неймаведама як і за якія, так бы мовіць, шышы, праяўляюць цуды аддаласці роднай фабрыцы і аскетызму. Я днямі размаўляў з гэтымі схуднелымі, няголенымі, апранутымі больш чым у сціплую вопратку рабочымі каля фабрычнай прахадной. Яны два-тры дні на тыдзень працуюць, а астатні час дзяжураць каля касы, чакаючы выплаты сваіх заробкаў.

Людзі расказалі, што ў снежні спрабавалі праводзіць сядзячую забастоўку проста на рабочых месцах. Але што тут выседзіш, калі няма інвестыцыяў у вытворчасць, калі няма багатых рынкаў збыту?

Яшчэ горшае жыццё ў вяскоўцаў Барысаўшчыны. Яно характарызуецца мізэрнааплатнай працай ды фіксаванымі коштамі, якія навязвае дзяржава калгаснікам на продаж ёй жа, дзяржаве, выработленай сельгаспрадукцыі.

Каб надаць вясковым праблемам барысаўскі каларыт, звернемся да калгаса «Чырвонапартызанскі». Там на пачатак студзеня за выплату даўгоў была распрададзеная ўся жыўнасць і ўся наяўная сельгастэхніка. Як засведчылі журналісты, у кіраўнікоў гаспадаркі ў сейфу засталася толькі калгасная пячатка. Цяпер у апошніх галовы баляць пра тое, як і чым цяпер заняць механізатараў, даярак, паляводаў, як уратаваць іх ад гранічнай галечы.

Дзе ж пры вось такім раскладзе спраў у горадзе або на вёсцы купяць тыя ж барысаўцы, што некалі былі «*простыми советскими людьми, строящими светлое здание коммунизма*», зямельны ўчастак, каб на ім паставіць хаця звычайную хату, ужо не кажучы пра катэдж?

Магчыма, у другой спробе ўзгаданага аукцыёну возьмуць удзел барысаўскія базарныя бізнесоўцы, якіх мы ўсе прывыклі называць чаўнакамі? Але ж і яны асабліва не балююць. На іх дзяржкіраўніцтва зараз навешала столькі новых падаткаў і розных выплат, што ўздыхнуць немагчыма.

Справа даходзіць да абсурду: у кожнай палатцы павінен стаяць касавы апарат. Але як, напрыклад, павінен гэты апарат працаваць узімку на барысаўскіх рэчавых рынках «Стадыён» ці «Спатканне» — адкуль запітвацца электрычнасцю? Тут бы ў самы раз страйкаваць. Аднак ці кіне працу дробны гандляр, калі трэба штодня карміць дзяцей, калі неабходна адкладаць сродкі на грашовы абарот?


У Барысаве чаўнакі здолелі па шмат якіх пытаннях дамовіцца з гарадскімі і раённымі ўладамі, у тым ліку наконт таго, што пакуль ім не трэба купляць тыя касавыя апараты. Гэта, мусіць, кіраўніцтву беларускай дзяржавы не трэба думаць пра грашовы баланс краіны. Яно будуе цікавы грамадска-палітычны лад — рынкавы сацыялізм. ■

ПОСТСАВЕЦКІЯ НАВІНЫ

Грузія. У бліжэйшы час магчымае чарговае абвастрэньне расейска-грузінскіх адносінаў у сувязі з тым, што прэзыдэнт Грузіі Эдуард Шэварднадзэ заявіў, што не зьбіраецца падпісваць дакумант пра працяг мандату расейскіх міратворчых сілаў у зоне грузіна-абхазкага канфлікту. Прычын гэтага дэмаршу дзьве. Па-першае, Грузія незадаволеная тым, што Расея безь яе згоды аднавіла чыгуначнае спалучэньне паміж Сухумі і Сочы. Як кажуць у Тбілісі, Грузія ня супраць гэтага кроку ў прынцыпе, але, па-першае, гэта павінна вырашацца на ўзроўні грузіна-расейскіх дамоўленасьцяў, а па-другое, толькі пасьля таго, як у Абхазію пачнуць вяртацца бежанцы. Шэварднадзэ сказаў, што пасьля вывучэньня сытуацыі Грузія зьдзейсьніць крокі, якія засьведчаць пра яе скрайнюю незадаволенасьць. Другая прычына больш глыбокая. Грузія выказвае пратэст супраць таго, што Расея ў масавым парадку выдае жыхарам Абхазіі расейскае грамадзянства. Большасьць з 300-тысячнага насельніцтва гэтай бунтоўнай рэспублікі атрымалі за апошнія некалькі год расейскія пашпарты. Гэта вельмі ўскладняе ўрэгуляваньне канфлікту, а ў пэрспэктыве можа стаць падставаю да расейскіх тэрытарыяльных прэтэнзіяў да Грузіі.

Украіна. На мінулым тыдні ўкраінскі ўрад разглядаў дэпутацкі запыт некалькіх дэпутатаў апазыцыйных фракцыяў наконт мэтазгоднасьці знаходжаньня ва Ўкраіне пасла Расеі Віктара Чарнамырдзіна. Паводле ўкраінскіх парлямантароў, пад час аднаго «круглага стала» ў канцы мінулага году Чарнамырдзін дазволіў сабе рабіць указаньні ўкраінскай дзяржаве аб пажаданай зьнешняй палітыцы. У прыватнасьці, ён казаў, каб Украіна абмежавала свае кантакты з Эўрапейскім зьвязам. Апазыцыйныя дэпутаты лічаць, што пасьля такіх выказваньняў Чарнамырдзіна належыць выслаць з краіны за паводзіны, несумяшчальныя са статусам дыплямата. Гэта ўжо ня першы раз, калі Чарнамырдзін груба парушае дыпляматычны этыкет, а апазыцыйныя палітыкі патрабуюць яго высылкі з краіны.

Туркменія. Сапармурат Ніязаў на мінулым тыдні заявіў у прамым эфіры нацыянальнага тэлебачаньня, што выбары новага прэзыдэнта Туркменіі павінныя адбыцца ў 2008–2010 гадах. Да гэтага часу вышэйшы прадстаўнічы ворган улады краіны, які выконвае функцыі парляманту, павінен кожны год называць па 3–5 прэтэндэнтаў на пасаду прэзыдэнта дзеля таго, каб стварыць кадравы рэзерв на той выпадак, калі з туркменбашы нешта здарыцца. На думку туркменскага дэспата, гэта павінныя быць вядомыя ня менш за 10 год ў краіне людзі. Туркменбашы, які ў савецкія часы быў першым сакратаром мясцовай камуністычнай партыі, выбраны на ўсенародным рэферэндуме пажыцьцёвым прэзыдэнтам сваёй краіны.



Удзельнікі гэтак званага пакушэньня на туркменбашы, якое мела месца ў канцы лістапада мінулага году, на гэтым тыдні павінныя паўстаць перад судом. Усяго па гэтай справе праходзіць 32 абвінавачаных. Як заявіў туркменбашы, 12 зь іх будуць асуджаныя да зьняволеньня, а 5 – высланыя на пасяленьні ў аддаленыя пустынныя раёны краіны. Што будзе з астатнімі, прэзыдэнт Туркменіі не ўдакладніў.

У сувязі з гэтай справай Туркменія разважае пра прыпыненьне дамовы з Расеяй пра падвойнае грамадзянства. Паводле туркменбашы, дзякуючы таму, што злачынцы маюць расейскія пашпарты, яны могуць ўцякаць у Расею і там заставацца бескарнымі. Гэтая заява туркменскага прэзыдэнта ўжо выклікала негатыўную рэакцыю ў Маскве. У самой жа Туркменіі распрацоўваюцца законапраекты, якія зробяць працэдуру выдачы візаў больш жорсткай, а кантроль за замежнікамі ўнутры краіны больш шчыльным. Туркменія каля двух год таму ў аднабаковым парадку ўвяла візавы рэжым з большасьцю постсавецкіх краінаў.

Кіргізія. У Кіргізіі на Арлоўскім хіміка-мэталюргічным камбінаце шасьцёра невядомых, абяззброіўшы і зьбіўшы ахову, скралі каля 460 кіляграмаў аксіду эўропію – рэчыва, якое выкарыстоўваецца пры прадукцыі атамнай зброі. Эўропій – рэдказямельны элемент – выкарыстоўваецца пры прадукцыі стрыжняў ядзерных рэактараў, але таксама дзеля вытворчасьці сталі, аптычнага шкла, рэнтгенаўскіх установак і кінескопаў. Паводле кіргізкіх праваахоўных ворганаў, збройны напад меў «*ярка выражаны сплянаваны і заказны характар*». На дадзены момант вядзецца сьледзтва.

Малдавія. На мінулым тыдні ў будынку ўраду Малдавіі адбыўся пажар. Увечары на дэжурны пульт пажарнай аховы Кішынёва паступіла інфармацыя пра агонь у кабінеце аднаго з віцэ-прэм'ераў ураду. На момант прыезду пажарных брыгадаў з вокнаў будынка на трэцім паверсе, дзе знаходзяцца кабінеты прэм'ер-міністра і ягоных намесьнікаў, вырываўся агонь. У хуткім часе пажар удалося пагасіць. Паводле папярэдніх зьвестак, прычынай пажару было кароткае замыканьне электраправодкі.

